ЧАС ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЖАДАННЯЎ 6

ЯК НАРАДЖАЕЦЦА ЗЗЯННЕ... 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 СТУДЗЕНЯ 2022 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 4 (29626)

КАРАТКА

• У 2021 годзе фізічныя асобы прадалі замежнай валюты на $53,4 млн больш, чым купілі, сведчаць статыстычныя даныя Нацыянальнага банка краіны.

• **Дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Бажэна Ярэміч анансавала выхад новай лінейкі адзення прэзідэнцкага мерча пад брэндам «Першы».**

• Беларускія медыкі выратавалі нованароджаную дзяўчынку і яе 37-гадовую маці, у якой з-за COVID-19 перасталі дзейнічаць лёгкія.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КІЙКО, першы намеснік міністра фінансаў:

«Нягледзячы на тое, што падаходны падатак фарміруе значную частку дзяржбюджэту і тым больш важны для мясцовых бюджэтаў, нельга стварацъ залішнюю падатковую нагрузку на грамадзян і забіраць большую суму, чым неабходна для фінансавання дзяржрасходаў. Пакуль што неабходнасць у павышэнні падаходнага падатку ў нас адсутнічае. У тэорыі, падаткаў павінна быць як мага менш, а спосаб іх выплаты мусіць быць максімальна зручны. Такім чынам выбудаваны падатковыя сістэмы развітых краін. Тым не менш яшчэ ніхто не змог рэалізаваць канцэпцыю аднаго падатку ў эканоміцы. Усё ж такі ёсць розныя віды даходаў, якія атрымліваюць эканамічныя агенты. Гэта і прадпрыемствы, і фізічныя асобы. Такая разнастайнасць адносін паміж імі. Таму стандартная сістэма змяшчае 7-8 плацяжоў, якія даюць магчымасць збіраць даходную частку бюджэту ў неабходным памеры для фінансавання дзяржаўных расходаў».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы павінны разумець, што ёсць нейкія маральныя асновы»

На вялікае свята ў храме Прэзідэнт гаварыў аб самых важных рэчах

Фота БелТА.

Калядную раніцу Аляксандр Лукашэнка правёў у храме Прападобных Опцінскіх Старцаў у Мінску. Кіраўнік краіны запаліў калядную свечку, падарыў храму ікону Мікалая Цудатворца работы беларускай майстэрні «Цесля». Таксама Прэзідэнт звярнуўся да прыхаджан з невялікай прамовай.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за запрашэнне і дадаў, што вельмі любіць наведваць такія невялікія драўляныя храмы, як гэты. Тут, па яго словах, уся сутнасць беларускага народа.

Прэзідэнт адзначыў, што Каляды — гэта магчымасць падвесці вынікі мінулага года. Так, ён падкрэсліў, што 2021 год быў урокам для нас, калі мы змаглі прааналізаваць свае ўчынкі. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: апошнія падзеі паказалі, што Гасподзь папярэдзіў: калі і далей будзем так жыць, то сутыкнёмся з яшчэ большымі праблемамі.

Адна з іх, заўважыў кіраўнік краіны, — пандэмія. Ён нагадаў, што на самым яе пачатку выказваўся супраць закрыцця прадпрыемстваў, устаноў, каранцінаў. «Нашым шляхам пайшлі ўсе. Але гэта не прынята казаць, падумаеш, нейкая Беларусь нешта сказала. Але мы мелі рацыю», — адзначыў Прэзідэнт. Ён дадаў, што ў пандэмічны год наша эканоміка паказала добры рост, і краіна пераадолела многія нягоды.

Закрануў Прэзідэнт і тэму падзей у Казахстане. Па яго словах, сяброўская нам краіна трапіла ў бяду, таму рэзервовыя міратворчыя сілы Беларусі ў складзе кантынгенту АДКБ былі перакінуты туды. «Казахстан успыхнуў, палаюць усе буйныя гарады. Мы занепакоены тым, што адбываецца. Гэта краіна, з якой звязаны Дагаворам аб калектыўнай бяспецы, — расказаў Прэзідэнт. — Нашы хлопцы разам з расіянамі спрабуюць зблізіць пазіцыі ўлады і збунтаванага народа. Мы гэта перажывалі. Я папярэджваў: як толькі мы дапусцім расколіну, туды хлыне вада». Паводле слоў Прэзідэнта, падзеі на поўдні Казахстана — спроба замежнага ўмяшання, трэба яшчэ разабрацца, хто стаяў за бандытамі.

СТАР. 2

БАГДАН — ЗНАЧЫЦЬ ПЕРШЫ!

У навагоднюю ноч нарадзіліся 54 маленькія беларусы. А першынцам гэтага года ў краіне стаў Багдан Некрашэвіч з Калінкавіч. Хлопчык нарадзіўся на другой хвіліне 2022-га. Маленькі асілак вагой 3 кг 715 г і ростам 53 сантыметры — другое дзіця ў сям'і. Старэйшаму Уладу сёлета споўніцца пяць гадоў. Менавіта ён падказаў бацькам імя для браціка. Багдан — падарунак на Новы год не толькі ўсёй сям'і, але і дзядулю, які святкуе дзень нараджэння таксама 1 студзеня.

Для Ірыны і Дзмітрыя Некрашэвічаў нараджэнне сына пад бой курантаў стала вялікім і нечаканым падарункам. «Папярэдне дата родаў была прызначана на 10 студзеня. Але малы вырашыў, што яму пара. Мы з Уладзікам рыхтаваліся да Новага года, збіралі падаруначкі для гасцей, наразалі салацікі. І раптам... Сказала мужу, што трэба збірацца ў радзільню... Гэта самы лепшы падарунак, які можа быць», — згадала падзеі вечара 31 снежня шчаслівая маці Ірына. Яна спадзяецца, што сынок, народжаны першага чысла першага месяца года, ва ўсім будзе лідарам.

Першынца ўсёй краіны віншавалі на самым высокім узроўні. Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч перадаў цёплыя пажаданні і падарункі ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У прэзідэнцкім кошыку — усё неабходнае для немаўляці, а таксама сертыфікат на камфортную манеўраную каляску, якую бацькі змогуць выбраць на сваё меркаванне. Перадаў Дзмітрый Піневіч і заказ ад кіраўніка дзяржавы на трэцяе дзіця. Муж і жонка Некрашэвічы адзначылі: час пакажа, магчыма, будзе ў брацікаў і сястрычка.

Фота БелТА.

Багдан НЕКРАШЭВІЧ з мамай Ірынай.

Падарункі сям'я атрымала і ад Міністэрства аховы здароўя, ад кіраўніцтва вобласці і раёна.

«Мы павінны разумець, што ёсць нейкія маральныя асновы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Накіравалі кантынгент наш туды разам з Расіяй, падключацца і іншыя дзяржавы АДКБ. Гэта цвяроза дзейнічае на тых, хто вырашыў там пагрэць рукі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што там усяго адна рота ваеннаслужачых беларускіх міратворчых сіл, якая дапамагае наладзіць мір. «Мы ў Казахстан прыйшлі не забіваць і нават не ваяваць. Нашы вайскоўцы і мы — мірныя людзі. Мы прыйшлі дапамагчы ім», — сказаў Прэзідэнт. Кіраўнік краіны адзначыў, што дапамагчы Казахстану важна, бо гэта эканамічны партнёр Беларусі.

Паводле слоў Прэзідэнта, гэты год будзе няпросты, і свет зменіцца ў плане аб'яднання народаў і дзяржаў у саюзы.

«Такім дзяржавам, як мы, у адзіночку будзе немагчыма выжыць. Таму я і ўзяў жорсткі курс на тое, каб захаваць наш суверэнітэт і незалежнасць, каб мы былі ў цеснай звязцы з нашымі сябрамі і братамі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка і падкрэсліў, што супрацьстаянне ў Казахстане — спроба атакаваць постсавецкія дзяржавы па перыметры Расіі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асновай палітыкі ў Беларусі будзе маральнасць. «Мы павінны, нарэшце, зразумець, што жыццё — гэта не толькі чэрава набіць і ўсё астатняе, што з гэтага вынікае. Мы павінны разумець, што ёсць нейкія маральныя асновы. Перш за ўсё — патрыятызм і любоў да сваёй зямлі, у імя чаго мы павінны жыць і выхоўваць нашых дзяцей», — сказаў беларускі лідар.

«Давайце падумаем пра дзяцей. Гэта — галоўнае. Гэта — аснова цяперашняй нашай палітыкі», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў Беларусі нядаўна зацверджаны бюджэт на бягучы год, і ў ім амаль палова накіроўваецца менавіта на сацыяльныя патрэбы, у тым ліку адукацыю, ахову здароўя, культуру, спорт, маральнае выхаванне. «Учора мы з гэтага і пачалі, гаворачы пра гістарычную палітыку нашай дзяржавы. Мы павінны нарэшце людзям сказаць, адкуль мы і што вакол нас няма тых дзяржаў, якія маюць больш старажытныя карані, чым мы. Мы павінны сказаць людзям праўду, якую не маглі з-за палітыкі гаварыць раней. Гэта вельмі важна для маральнага выхавання і для разумення таго, хто мы і адкуль», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён выказаў надзею, што царква акажа ўладам падтрымку, бо гэта не пярэчыць яе канонам.

«Будзе дзяржава, будзе ўлада і царква. Страцім яе — не будзе нічога. Вернемся да таго, што было некалькі стагоддзяў таму. Разлічваю на вашу падтрымку і разуменне. І яшчэ раз абяцаю: я вас не падвяду, вам за мяне сорамна не будзе», — дадаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што часам не ўсё можа сказаць адкрыта — такія законы палітыкі: «Кажуць, грошы любяць цішыню. Палітыка таксама любіць дыпламатыю і цішыню, — заўважыў Прэзідэнт. — Але я заўсёды знайду магчымасць растлумачыць вам свае дзеянні і ўчынкі, як і ўсіх тых, хто мне падначалены ў нашай краіне. Спадзяюся на вашу падтрымку, разважлівасць і ваша цярпенне. Не спяшайцеся, калі чагосьці не разумееце. Гэта — галоўнае. Не спяшайцеся. Як у нашым народзе кажуць, час усё расставіць на свае месцы. Так, як было з 2020 годам, так, як было ў мінулым годзе. Мы сталі іншымі, мы вельмі многае разумеем. І дзякуй Богу, што гэта адбылося і мы нарэшце зразумелі, ацанілі, што мы маглі страціць».

«Таму давайце будзем цаніць тое, што ў нас ёсць, давайце будзем цаніць тое, што Ён нам дае і ад чаго нас уберагае», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

«Упершыню за гады сваёй незалежнасці мы ставім гэтыя два паняцці — «гісторыя» і «палітыка» — побач»

Чаму настаў час пісаць гісторыю з уласнай, беларускай пазіцыі, не баючыся пакрыўдзіць кагосьці з суседзяў

У канцы працоўнага тыдня Прэзідэнт правёў у Палацы Незалежнасці нараду па пытаннях рэалізацыі гістарычнай палітыкі з шырокім колам удзельнікаў. Нагодай для гэтай тэмы стала аб'яўленне 2022-га Годам гістарычнай памяці. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, год пройдзе пад знакам захавання гераічнай спадчыны і праўды пра ўсе перыяды жыцця беларускага народа. Патрэбна сістэматызаваць гістарычныя даследаванні, мемарыяльныя комплексы, вызначыць на перспектыву даты, падзеі, асоб, якіх трэба ўвекавечыць, унесці карэктывы ў работу па патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі з апорай на факты гераічных подзвігаў беларусаў.

Як працягнуў у сваім выступленні Прэзідэнт, сёння ўся гэтая работа з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі Беларусі. Менавіта цяпер трэба ўдзяліць самую пільную ўвагу пытанням так званай гістарычнай палітыкі.

«Адзначу: упершыню за гады сваёй незалежнасці мы ставім гэтыя два паняцці — «гісторыя» і «палітыка» — побач. ***Да гэтага часу мы стараліся не палітызаваць гісторыю. Абраны беларускім народам палітычны курс краіны быў накіраваны на захаванне добрых адносін з суседзямі. Мы спынялі любую праяву рэваншызму, нацыяналізму, шавінізму і іншых ідэй, якія дыскрымінуюць гісторыю, культуру, іншыя народы,*** — заявіў кіраўнік краіны. — ***Мы не вялі войнаў памяці ў мэтах умацавання сваёй дзяржаўнасці. Імкнуліся не закрануць нацыянальныя пачуцці тых, з кім калісьці жылі ў адзіных дзяржавах. А падстаў у беларусаў дастаткова».***

У той жа час, дадаў Прэзідэнт, некаторыя нашы суседзі выбудоўвалі ўласную гістарычную палітыку, фарміравалі інстытуты і праграмы пад канкрэтныя палітычныя мэты і палітыкаў.

«Для адных, як я ўжо казаў, Беларусь — гэта плацдарм на Расію. Іншыя пакутуюць фантомнымі болямі — усё шукаюць тут свае гістарычныя землі. І першым, і другім суверэнная Беларусь і беларускі народ не патрэбны», — сцвярджае Прэзідэнт.

Паводле яго, на гэтыя мэты былі кінуты немалыя сродкі. З 90-х пачаўся перыяд ашалелай палітызацыі гісторыі, калі яе перакулілі з ног на галаву, раскалолі грамадства, а краіна была за крок ад страты нацыянальнай дзяржаўнасці.

«Не без дапамогі Сораса, «сарасят» знутры, які ўзяўся за выданне новых падручнікаў па гісторыі Беларусі. Да 1994-га кіраваныя амерыканцамі «свядомыя» паспелі многае перапісаць і вывучыць частку дзяцей. Ды і мы з вамі паддаваліся на некаторыя рэчы. Тыя вучні і студэнты, выхаваныя на створаных тады гістарычных фэйках, сёння самі бацькі. Вынік навязанай нам у тыя гады рамантызацыі і выпячвання некаторых перыядаў у гісторыі беларускага народа мы бачым цяпер», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ва ўяўленні часткі нашай адукаванай моладзі Напалеон, які пабяцаў аднавіць Рэч Паспалітую, быў «вызваліцелем», а партрэтаў літоўскай і польскай шляхты па ўсёй краіне было больш, чым герояў Вялікай Айчыннай вайны ці сучаснай гісторыі, заўважыў Прэзідэнт. «Плён» такога «патрыятычнага» выхавання, кажа кіраўнік краіны, назіралі ў 2020-м.

«Але няма ліха без дабра. Дзякуючы гэтым падзеям цяпер усе ведаюць сапраўдную гісторыю сімвала акупацыі роднай зямлі і здрады беларускаму народу. Многія, хто развешваў у сябе на вокнах бчб-анучы, сёння гэтага саромеюцца. Разумеюць, хто імі кіраваў. Але дрэнна тое, што ў дадзеным выпадку нам давялося рэагаваць на падзеі. А мы павінны былі іх апярэдзіць», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Па словах Прэзідэнта, неабходна прызнаць, што «старонкі айчыннай гісторыі ператварыліся ў інфармацыйнае поле бою», і здарылася гэта не цяпер.

«Гістарычная палітыка з'яўляецца стратэгіяй самазахавання ва ўмовах глабальнага перадзелу сфер уплыву ў свеце. Гэта фактар нацыянальнай бяспекі. Я хачу, каб вы, навуковыя дзеячы, палітолагі, эксперты, мяне правільна зразумелі. ***Сваю гісторыю мы перапісваць не будзем.*** Прынамсі, пры дзеючым Прэзідэнце. ***Але і не будзем больш замоўчваць факты. Нават калі яны закранаюць нечыя амбіцыі ці нацыянальныя пачуцці. Як у выпадку са злачынствамі беларускіх, а таксама польскіх, літоўскіх, украінскіх калабарацыяністаў у гады Вялікай Айчыннай вайны».*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, недапушчальна выключна крытычна глядзець на савецкую спадчыну, замоўчваючы дасягненні і перамогі эпохі. Як мінімум несправядліва акультурваць іншыя гістарычныя перыяды, не надаючы значэння фактам знявагі і дыскрымінацыі беларусаў.

«І калі сёння літоўцы і палякі адмаўляюць уклад беларускага народа ў развіццё такіх гістарычных форм дзяржаўнасці на нашай зямлі, як ВКЛ і Рэч Паспалітая, то што нам перашкаджае даць гэтым перыядам адэкватную ацэнку? Давайце ў падручніках па гісторыі, у замкавых і музейных экспазіцыях так і назавём, напрыклад, перыяд Рэчы Паспалітай акупацыяй беларускай зямлі палякамі», — выказаў думку Прэзідэнт і абгрунтаваў яе тым, што для нашых продкаў у той перыяд родная мова, культура, вера былі пад забаронай, зневажалася чалавечая годнасць, але народ выжыў і захаваў сваю самабытнасць.

Выказаўся Аляксандр Лукашэнка наконт значэння ВКЛ, назваўшы яго нашай дзяржавай, якую нельга аддаць літоўцам толькі з-за назвы. ***«Сучасныя літоўцы фактычна прыватызавалі спадчыну гэтага дзяржаўнага ўтварэння. Але што там было літоўскага? Мова наша, на ёй жа напісана і Канстытуцыя — Статут. Пануючая вера — праваслаўе. Тэрыторыі — беларускія, украінскія і часткова рускія землі. Народ на 80 працэнтаў — наш. Славяне. А гэта асноўныя атрыбуты дзяржаўнасці».*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, абарона слаўнага шматвяковага летапісу беларускага народа — гэта пытанне нашай нацыянальнай годнасці, і нам ёсць, чым ганарыцца.

«Чаго толькі вартая гісторыя Полацкага і Тураўскага княстваў, якая неяк згубілася на фоне гістарыяграфічнай, навуковай і культурнай цікавасці да іншых старажытных эпох. Але давайце не будзем забываць, што як нацыя мы канчаткова сфарміраваліся менавіта за савецкім часам. Менавіта тады пачалася гісторыя беларускай дзяржавы. І сёння мы працягваем яе пісаць. Нам трэба перайсці на новы этап, як гавораць эксперты, пачаць вызначаць і фарміраваць сэнсы ў галіне нацыянальна-гістарычнага развіцця беларускага народа і дзяржавы», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

«Задача — не дапусціць развіцця ідэй, якія могуць падарваць краіну ў будучыні. Для гэтага ў нас ёсць усё: і час, і неабходныя рэсурсы. Таму спакойна, без хістанняў нам трэба гэтыя пытанні адпрацаваць і канцэптуальна вызначыцца ў падыходах, пракласці моцны мост паміж мінулым і будучыняй Рэспублікі Беларусь. У нас павінна быць выпрацавана дакладная канцэпцыя ацэнкі падзей і ролі асоб у гісторыі. У гісторыі беларускай дзяржавы», — заявіў Прэзідэнт.

Па яго даручэнні Адміністрацыяй Прэзідэнта сумесна з Нацыянальным сходам, прадстаўнікамі гістарычнай грамадскасці, іншымі зацікаўленымі распрацаваны адпаведныя прапановы.

Але Аляксандр Лукашэнка просіць не ствараць дадатковых структур і спецыялістаў для рэалізацыі задач. Ён хоча бачыць актыўную ролю ў справе рэалізацыі гістарычнай палітыкі Акадэміі навук, універсітэтаў, канкрэтных асоб.

«Я бачу не толькі Гігіна з яго выдатнымі разважаннямі ў грамадстве, але і яго шматлікіх калег, якія гатовы працаваць. Давайце мы лепш ім грошы заплацім, чым будзем пладзіць сотні апаратаў, адміністрацый, што будуць займацца гістарычнай памяццю. Ды не будуць яны займацца, яны будуць вам толькі перашкаджаць», — мяркуе Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны заклікае гістарыкаў, сацыёлагаў пісаць навуковыя работы па тэме, размаўляць з калектывамі, студэнцкай супольнасцю, школьнікамі, каб работа па рэалізацыі гістарычнай палітыкі «не была замутнёная ў чыноўніцкім беспарадку».

«Калі мы не гатовы гэтым заняцца, лепш увогуле не ўлазіць у глабальную праблему. Сапсуём, а потым да яе вярнуцца будзе вельмі складана», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

Каментарый у тэму

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, пасля расказаў журналістам пра рашэнні, прынятыя на нарадзе па пытаннях рэалізацыі гістарычнай палітыкі. Ён адзначыў вялікую цікавасць грамадскасці да гісторыі краіны, але дадаў: і з боку апанентаў улады прымаюцца спробы наносіць удары па значных пытаннях гісторыі.

«Каб сёння супрацьстаяць фальсіфікацыі, спробам сказіць гісторыю, прапануюцца навацыі, якія не ламаюць створанага. На нарадзе абмяркоўваліся пытанні, як забяспечыць далейшую каардынацыю дзейнняў у гэтым кірунку, як увязаць усе структуры, перагледзець падыходы. Самае галоўнае — як часам складаныя гістарычныя тэмы даносіць простай мовай розным колам насельніцтва», — сказаў Ігар Сергеенка.

Таксама, па яго словах, абмяркоўвалі стварэнне Савета па гістарычнай палітыцы. Разглядаецца, на базе якой структуры ажыццявіць каардынацыю яго дзейнасці. Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, верагодна, гэта будзе Акадэмія навук.

«Тыя ж спецыялісты, але больш каардынацыі будзе ў навуковай, даследчай рабоце, каардынацыі пры падрыхтоўцы спецыялістаў для школ, ВНУ, пры падрыхтоўцы дысертацыйных тэм», — заўважыў Ігар Сергеенка.

Ён дадаў, што размова ішла і пра неабходнасць уносіць карэктывы ў вучэбныя праграмы па гісторыі для школьнікаў і студэнтаў, пра выданне новага падручніка па гісторыі беларускай дзяржаўнасці для студэнтаў ВНУ.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
3 студзеня 2022 г. № 3 г. Мінск

АБ ПРЫСУДЖЭННІ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту **пастанаўляю**:

1. За актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2021 года ў памеры 100 базавых велічынь кожнаму:

Бокію Ігару Аляксандравічу, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па інваспорце ўстановы «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту»;

Зайцаву Артуру Яўгенавічу, старшаму трэнеру нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па барацьбе вольнай дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі «Стайкі»;

Ляпарскай Ірыне Юр'еўне, галоўнаму трэнеру нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па гімнастыцы мастацкай установы «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па гімнастыцы мастацкай».

2. Міністэрству фінансаў у 2022 годзе выдзяліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту і турызму сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2021 года з улікам памеру базавай велічыні на дату выплаты.

3. Не абкладаць падаходным падаткам з фізічных асоб сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2021 года, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з дадзеным Указам.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
6 студзеня 2022 г. № 5 г. Мінск

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і ідэй міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2021 года:

грамадскаму аб'яднанню «Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру» — за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, увекавечанне памяці абаронцаў Айчыны, рэалізацыю разведвальных пошукавых праектаў «Памяць», «Дняпроўскі рубеж» і «Сожскі рубеж» на Магілёўшчыне;

калектыву дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Брэста» — за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, рэалізацыю праекта «Пост Памяці Брэсцкай крэпасці», актыўны ўдзел у міжнародным міратворчым руху;

мясцоваму дабрачыннаму фонду імя Аляксея Талая — за асаблівыя заслугі ва ўвасабленні ідэй гуманізму, рэалізацыю дабрачынных праектаў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці і традыцый, падтрымку дзяцей, якія пацярпелі ад ваенных дзеянняў;

протаіерэю Кірылу Уладзіміравічу Шолкаву, настаяцелю храма іконы Божай Маці «Усецарыца» ў г. Мінску, старшыні Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні Беларускай Праваслаўнай Царквы, — за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцяў, самаадданую працу ў галіне асветніцтва і царкоўнай дабрачыннасці;

Рэспубліканскаму грамадскаму аб'яднанню «Патрыёты Беларусі» — за рэалізацыю сацыяльна значных праектаў, накіраваных на фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2021 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
6 студзеня 2022 г. № 6 г. Мінск

АБ ПРЫСУДЖЭННІ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, журналістыкі, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2021 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Гладкай Людмілы Леанідаўны, аглядальніка рэдакцыі аддзела палітычнай інфармацыі ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Выдавецкі дом «Беларусь сегодня», Карповіча Алега Іванавіча, аглядальніка аддзела падрыхтоўкі ілюстрацый упраўлення аб'яднанага сакратарыята ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Выдавецкі дом «Беларусь сегодня», Цераховіча Юрыя Леанідавіча, генеральнага дырэктара таварыства з абмежаванай адказнасцю «Тэхнагруп», — за значны ўклад у развіццё беларускай журналістыкі, стварэнне цыкла публікацый па актуальных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны;

Громаву Уладзіміру Валер'евічу, артысту-вакалісту (салісту) — вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь», народнаму артысту Беларусі, — за стварэнне высокамастацкіх вобразаў у прэм'ерных спектаклях Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму ансамблю танца «Крыжачок» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — за значны ўклад у захаванне традыцый харэаграфічнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь узорнаму тэатру эстрады «Капелька» Мірскага сельскага Дома культуры дзяржаўнай установы культуры «Баранавіцкая раённая клубная сістэма» — за значны ўклад у выхаванне творчай моладзі, паспяховы ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях;

заслужанаму калектыву Рэспублікі Беларусь Прэзідэнцкаму аркестру Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай установы «Палац Рэспублікі» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — за значныя дасягненні ў развіцці эстраднага мастацтва, рэалізацыю музычных праектаў у рамках Года народнага адзінства;

Казачку Васілію Андрэевічу, загадчыку філіяла № 15 Цэнтра ганчарства в. Гарадная дзяржаўнай установы культуры «Столінская раённая клубная сістэма», — за значны асабісты ўклад у захаванне традыцый ганчарнага рамяства;

калектыву ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» — за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, рэалізацыю грамадска-культурных праектаў;

Клімко Наталлі Аляксандраўне, кіраўніку народнага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь клуба майстроў народнай творчасці «Каляровая альтанка» Навагрудскага раённага Цэнтра рамёстваў дзяржаўнай установы культуры «Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці», — за плённую працу па захаванні традыцый вырабу беларускай выцінанкі;

Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту Рэспублікі Беларусь — за арганізацыю і правядзенне спартыўна-культурнага фестывалю «Выткі. Крок да Алімпу», накіраванага на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, умацаванне сямейных каштоўнасцяў і захаванне нацыянальных традыцый.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2021 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

Аляксей ТАЛАЙ:

«ПРЭМІЯ НАС НАТХНЯЕ, МАТЫВУЕ, АЛЕ ГЭТА НЕ ПРЫЧЫНА РАССЛАБЛЯЦЦА»

Для мясцовага дабрачыннага фонду імя Аляксея Талая новы год пачаўся з прыемных навін. За асаблівыя заслугі ва ўвасабленні ідэй гуманізму, рэалізацыю дабрачынных праектаў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці і традыцый, падтрымку дзяцей, якія пацярпелі ад ваенных дзеянняў, фонду прысуджана прэмія «За духоўнае адраджэнне». Кіраўнік і ідэйны натхняльнік фонду Аляксей Талай падзяліўся ўражаннямі ад такога высокага прызнання і расказаў, як гэта паўплывае на далейшую працу.

«Я думаю, што ўсе праекты нашага фонду былі дзеля вызначаной мэты. Некаторыя з іх накіраваны на пад'ём нашай нацыянальнай самасвядомасці, на патрыятычнае выхаванне моладзі. Мы не мелі магчымасці распыляцца на ўсё, таму абралі стратэгічныя кірункі і дапрацоўвалі іх па максімуме. Мы стараемся ўдзельнічаць ва ўнутрынацыянальным дыялогу і шукаць крокі судакранання, каб усе беларусы, нягледзячы на палітычныя рознагалоссі, на розныя погляды на жыццё, маглі аб'яднацца і працаваць на ўмацаванне нашай краіны. Тады жыццё нашых людзей будзе лепшым, а дзеткі будуць выхоўвацца і расці ў шчаслівай і добрай краіне», — падкрэсліў Аляксей Талай.

Грамадскі дзеяч мяркуе, што прэмія прысуджана ў тым ліку і за тое, што дабрачынны фонд з апорай на неабыякавых беларусаў дапамог дзецям, якія пакутуюць ад баявых дзеянняў на Данбасе. Вясной 2021 года Аляксей адправіўся на Данбас, каб не ў інтэрнэце, а ўжывую падтрымаць дзяцей, якія там жывуць. На свае вочы ўбачыў усе наступствы ўзброеных канфліктаў і зразумеў: дзяцей трэба ад гэтага засцерагчы, хоць бы на некалькі тыдняў. Ініцыятыву падтрымаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, ён падпісаў адпаведнае распараджэнне. Дабрачынны фонд Аляксея Талая ўзяў на сябе арганізацыйны бок, Міністэрства замежных спраў Расіі дапамагло вырашыць пытанні з дакументамі. Усяляк дапамагалі і беларускае Міністэрства адукацыі, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. А неабыякавыя паспрыялі фінансава. І ў верасні 150 маленькіх жыхароў Данбаса прыехалі на рэабілітацыю і адпачынак у беларускую краіну дзяцінства — Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня».

«Узначаліўшы гуманітарную місію на Данбас, мы ўзялі на сябе вялікую ролю і адказнасць прадстаўляць там Рэспубліку Беларусь. Галоўным дэвізам было «Не навошкодзь», — гаворыць ён. — Нам хацелася зрабіць вельмі шмат, сэрца і душа балелі за тую зямлю, за людзей, якія там жывуць. Але мы абдумвалі кожны свой крок, каб не нашкодзіць краіне, адносінам паміж рознымі краінамі. У такіх справах усё павінна праходзіць акуратна, паэтапна і граматна. І без лішніх эмоцый. Так, дзесьці мы і плакалі. Ад убачанага на Данбасе нас літаральна трэсла. Было вельмі цяжка слухаць дзяцей, якія расказвалі аб сваіх загінулых бацьках.

Як разважлівыя людзі, мы ўсе павінны зразумець, што сёння вырашаецца лёс свету. І кожны няправільны крок можа кардынальна змяніць сітуацыю, і невядома, у які бок. Мы бачым, што сёння адбываецца ў Казахстане, ведаем, што туды ў рамках АДКБ адправіўся і беларускі кантынгент... І, канешне, мы не маглі пакінуць без увагі тое, што адбываецца ва Украіне, на Данбасе, гэта зусім побач з намі. Там жывуць родныя нам людзі, у многіх беларусаў там сваякі. Таму наш фонд накіраваў свае сілы туды на дапамогу дзецям, сіротам, дзецям-інвалідам. Мы вельмі рады, што атрымалася прывезці сюды дзяцей з дапамогай Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Мы і самі нешта можам, але без такой актыўнай дапамогі мы б не справіліся. Без падтрымкі кіраўніка дзяржавы ў нас бы не атрымалася ў сціслыя тэрміны з зоны баявых дзеянняў прывезці 150 дзяцей.

У «Зубраняці» дзеці ўбачылі, што такое жыццё без штодзённай бяспекі. Яны знайшлі новых сяброў, адпачылі. Для іх гэта вельмі важна. Нават дарослыя людзі, якія былі з імі, са слязамі на вачах казалі, што гэтыя ўражанні застануцца з дзецьмі на ўсё жыццё. Яны ніколі не забудуць таго, што зрабілі для іх людзі Беларусі і, канешне, наш Прэзідэнт. І мы далей будзем працаваць у гэтым кірунку. І я спадзяюся, што нашы беларусы будуць удзельнічаць, знойдуць той запаветны АРІП фонду Аляксея Талая і перавядуць сваю капеечку. Капейка да капейкі — і яшчэ адно дзіця з Данбаса зможа прыехаць на адпачынак у Беларусь».

У мінулым годзе Аляксей Талай атрымаў прэмію «Спартыўны Алімп» за сацыяльны праект «Спартсмены Беларусі: сіла ў адзінстве». Таму, паводле яго слоў, сёлета ўзнагарода стала нечаканай: «Такія прэміі нас натхняюць, матывуюць працаваць далей. Наперадзе яшчэ шмат спраў. І мы заўсёды будзем побач з добрасумленнымі і жыццесцвярджальнымі сіламі нашай краіны».

У цэнтры ўвагі дабрачыннага фонду Аляксея Талая заўсёды былі дзеці і моладзь: матэрыяльная дапамога дзецям-інвалідам, работа па прафілактыцы суіцыдаў сярод моладзі, патрыятычнае выхаванне. Таму на адной дабрачыннай місіі фонд і асабіста Аляксей Талай спыняцца не збіраюцца. Прычынай Аляксей называе нацыянальныя рысы беларусаў — неабыякавасць і гатоўнасць заўсёды прыйсці на дапамогу, асабліва калі справа датычыцца дзяцей: «Для нас дзеці — святое. Нашы дзяды і прадзеды ішлі ў бой за сваіх дзяцей, за свой род. Мы гэта ведаем, гэта наш нацыянальны вопыт. І мы не можам спакойна жыць у сваёй прыгожай краіне, калі недзе палае агонь вайны і пакутуюць дзеці. На гэта немагчыма заплюшчыць вочы. Таму па меры сіл і магчымасцяў мы будзем дапамагаць дзецям па ўсім свеце. Калі спатрэбіцца, паедзем і ў Сірыю, і ў Лівію. Туды, дзе нас чакаюць».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

«КАЛЯРОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ» З КАЗАХСКІМ АДЦЕННЕМ

Сёння ў Казастане аб'яўлены дзень нацыянальнай жалобы. Краіна будзе аплакваць і хаваць тых, хто загінуў за апошнія некалькі дзён. Тых, хто, яшчэ сустракаючы Новы год, быў жывы і здаровы, строіў планы на заўтра. Полымя ўзброенага мяцяжу, які быў справакаваны і зрэжысіраваны звонку, удалося патушыць. Але ніхто не верне ахвяр гэтага вар'яцтва — менавіта так называюць тое, што адбывалася ў гарадах краіны, самі яе жыхары.

Паводле апошніх звестак, загінулі 164 чалавекі. Дакладна вядома, што сярод загінулых ёсць дзеці. У Алматы 7 студзеня адкрылі агонь па аўтамабілі, у выніку чаго загінула чатырохгадовая дзяўчынка. Пра гэта расказала ўпаўнаважаны па правах дзіцяці ў Казахстане Аружан Саін, паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва Tengrinews. Раней у прэс-службе дзіцячага амбудсмена паведамлялі, што 11-гадовае дзіця загінула ад агнястрэльнага ранення падчас беспарадкаў у Алматы. Акрамя таго, у адну з дзіцячых бальніц горада з цяжкімі агнястрэльнымі раненнямі быў дастаўлены 15-гадовы падлетак, які пасля памёр. Ён ехаў з бацькам на машыне, калі іх аўтамабіль расстралялі тыя, хто нападаў... Таксама ўчора МУС краіны агучыла колькасць загінулых сілавікоў — 16. Тысяча трыста паліцэйскіх пацярпелі.

Нанесены і вялікі матэрыяльны ўрон. Спаленыя будынкі і машыны, разбітыя шыны, папсаваныя кулямі сцены дамоў. Агульная сума ўрону гандлёвым сеткам Казахстана ў выніку беспарадкаў і дзеянняў марадзёраў склала больш за 92,3 млрд тэнге. Аб гэтым паведамляюць мясцовыя СМІ са спасылкай на Нацпалату прадпрымальнікаў. Па цяперашнім курсе, гэтая сума складае прыблізна 212 млн долараў. Па словах кіраўніка МУС Казахстана Ерлана Тургумбаева, у Казахстане было разрабавана больш за 100 аб'ектаў гандлю і банкаў, папярэдняя шкода ацэньваецца ў звыш 87 млрд тэнге.

Учора Ерлан Тургумбаеў заявіў, што сітуацыя ва ўсіх рэгіёнах Казахстана, дзе адбыліся беспарадкі, стабілізавана. «Цяпер прадаўжаецца правядзенне контртэрарыстычнай аперацыі па адначасовай законнасці і правапарадку ў краіне. На сёння ва ўсіх рэгіёнах краіны сітуацыя стабілізавана. Сіламі правапарадку вызвалены ўсе раней захопленыя будынкі акіматаў (мясцовых адміністрацый). Аднаўляецца работа камунальных аб'ектаў і сістэм жыццезабеспячэння», — паведаміў ён.

Паводле яго слоў, раней асабліва складанае становішча было ў Алматы, дзе 5 студзеня арганізаваны натоўп з каля 20 тысяч чалавек распачаў спробу захопу будынка мясцовай адміністрацыі. З прычыны значнай колькаснай перавагі ім удалося прарваць некалькі ліній абароны і пракрасціся ў будынак. «Пры гэтым паўсюдна пратэстоўцамі ў месцах знаходжання і перад нападзеннем выводзіліся са строю камеры відэаназірання, барыкадаваліся праезныя часткі, па перыметры выстаўляліся назіральнікі. Для каардынацыі дзеянняў імі выкарыстоўваліся радыёстанцыі», — інфармаваў кіраўнік МУС.

Ён зазначыў, што каля 800 чалавек захапілі міжнародны аэрапорт Алматы. У выніку быў адменены вылет 60 рэйсаў і прылёт 56. Былі разрабаваны ўсе наяўныя ў будынку аэрапорта буцікі, магазіны і касы...

«Там усё, што можна было спаліць, спалілі, — расказваў Прэзідэнт Беларусі на нарадзе 6 студзеня. (Да гэтага ён ужо гаварыў па тэлефоне і з Прэзідэнтам Казахстана, і з Уладзімірам Пуціным, і з іншымі кіраўнікамі краін АДКБ.) — Захапілі аэрапорт. Прытым мэтанакіравана. І ў Алматы, і ў Нур-Султане была спроба захапіць аэрапорт. Мэтанакіравана. Таму што разумелі, што туды будуць перакінуты ўзброеныя сілы, найперш Расіі і краін АДКБ. Гэта значыць, трэба было ўзяць пад кантроль, каб нельга было прызямліцца там. Добра, што пад Алматы за 40 кіламетраў ёсць ваенны яшчэ аэрадром, які быў заўсёды пад кантролем ваенных». Тады ж Аляксандр Лукашэнка недвухсэнсоўна выказаўся аб знешняй арганізацыі беспарадкаў у Казахстане: «Але, самае галоўнае, усё было скаардынавана і спланавана ў многіх гарадах. А адлегласць — тысячы кіламетраў. Казахстан большы па тэрыторыі, чым, мусіць, уся Еўропа. Або Заходняя Еўропа — гэта дакладна. І адлегласці там, вядома, шалёныя. І маразы, і іншае. Але тым не менш, усё сінхронна адбылося. Спланавана было. Умяшанне звонку, вядома. У плане каардынацыі».

Эксперт Расійскага савета па міжнародных справах Мікіта Мяндковіч адзначае: «Што да генезісу, пратэст узнік першапачаткова з-за скачку цэн на газ у адной з абласцей. Але гэтай нагодай скарысталіся вонкавыя сілы для стымулявання выступленняў у іншых гарадах. У прыватнасці Алматы, дзе ішлі найбольш жорсткія сутыкненні, з'яўляўся цэнтрам прысутнасці заходніх няўрадавых арганізацый, якія шмат у чым выступаюць ініцыятарамі найбольш жорсткай пратэснай хвалі ў горадзе. На дадзены момант у ліку лідараў пратэсту — дзве зарэгістраваныя ў Казахстане партыі, якія фінансуюцца ЗША».

Эксперт падкрэсліў, як і ў Беларусі, актыўным ядром пратэсту ў Казахстане з'яўляюцца радыкальныя нацыяналісты. «Мы маем сапраўды вельмі жорсткую і магутную пратэсную хвалю, з якой, у адрозненне ад беларускага вопыту, справіцца ўлады не могуць. У той час як Аляксандр Лукашэнка падчас пратэстаў 2020 года праяўляў жорсткую бескампрамісную пазіцыю, што спачатку трэба навесці парадак, а потым гаварыць аб любых рэформах. Такаеў стаў патураць найбольш радыкальнаму крылу пратэстоўцаў і аб'явіў аб адстаўцы ўрада. Гэта не стабілізавала сітуацыю, а, наадварот, перакінула пагромшчыкаў у іх сіле і магчымасці націснуць на ўладу», — канстатаваў ён.

Дарэчы, беларускі лідар на саміце лідараў краін ЕАЭС папярэдзіў сваіх калег: будуць спрабаваць хістаць і іх, каб дабрацца да Расіі. І тое, што адбылося ў Казахстане, многія эксперты ацэньваюць як спробы аслабіць пазіцыі Расіі падчас перагавораў з ЗША аб бяспецы (чытай: аб сферах уплыву), якія запланаваны акурат на сёння ў Жэневе. Стварыць зону нестабільнасці ў краіне, з якой Расія мае самую працяглую граніцу, — лічы, перамога ў гэтых перагаворах і ў многіх наступных, калі яны будуць.

Паказальная і рэакцыя Захаду на тое, што адбывалася ў Казахстане, асабліва на рашэнне ўвесці ў краіну міратворчы кантынгент АДКБ. «Вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Жазэп Барэль адзначыў неабходнасць з асцярожнасцю ставіцца да прысутнасці замежных войскаў на тэрыторыі Казахстана. Але чаму не было заклікаў з асцярожнасцю ставіцца да прысутнасці, напрыклад, бельгійскіх войскаў на тэрыторыі Афганістана? Чаму не было заклікаў аналагічных у адносінах да іншых краін, якія не запрашалі туды войскі? Але чамусьці Барэль аб гэтым не выказваецца. А тут чамусьці заклапочанасць», — так пракаментаваў тое, што адбываецца, вядомы палітычны блогер з Украіны Анатолій Шарый.

Што датычыцца рашэння аб увядзенні кантынгенту АДКБ у Казахстан, эксперты сыходзяцца на тым, што менавіта гэта дазволіла сцішыць беспарадкі. Дарэчы, усё адбылася згодна з міжнародным правам і дагаворамі. Касым-Жармат Такаеў, прэзідэнт Казахстана, краіны-члена АДКБ, звярнуўся да іншых членаў АДКБ з просьбай дапамагчы, паколькі размова ідзе аб тэрарыстычнай атацы на дзяржаву і пад пагрозай нацыянальная бяспека. Генеральны сакратар АДКБ Станіслаў Зась па даручэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ 6 студзеня праінфармаваў ААН аб правядзенні ў Казахстане міратворчай аперацыі.

Ад Беларусі ў Казахстан была накіравана падрыхтаваная міратворчая рота са складу 103-й паветрана-дэсантнай Віцебскай брыгады сіл спецыяльных аперацый, у якой служаць толькі кантрактнікі. Учора намеснік камандуючага сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі Сяргей Андрэеў расказаў, што міратворчы кантынгент Беларусі выконвае задачу па ахове і абароне ваеннага аэрадрома.

Найбольшая колькасць ваенных з кантынгенту АДКБ — расійскія ваеннаслужачыя. Што не засталося без пільнай увагі ЗША і без пікіроўкі знешнепалітычных ведамстваў дзвюх краін. Дзяржсакратар ЗША Энтані Блінкен адзначыў, што яны занепакоеныя падзеямі ў Казахстане, але лічаць, што рэспубліка можа справіцца сама і без дапамогі АДКБ. Блінкен, гаворачы аб ролі АДКБ ва ўрэгуляванні сітуацыі, у прыватнасці, вымавіў наступную фразу: «Адзін урок з мінулай гісторыі — калі ў тваім доме апынуліся рускія, іх бывае складана прымусіць сысці». Афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава ў адказ на словы Блінкена вельмі трапна заўважыла, што «калі Энтані Блінкен так любіць урокі гісторыі, то няхай мае на ўвазе наступны: калі ў тваім доме апынуліся амерыканцы, бывае складана застацца ў жывых, не быць абрабаваным ці згвалтаваным».

Увогуле, гэта першы выпадак увядзення войскаў АДКБ для дапамогі аднаму з членаў арганізацыі, гэта быў для яе своеасаблівы экзамен. «Тут сапраўды трэба апладзіраваць кіраўніцтву АДКБ, адзінства было праяўлена. І Беларусь, і Кыргызстан, і Арменія заявілі аб гатоўнасці паўдзельнічаць у гэтай аперацыі, пры тым што размова ідзе аб абароне вельмі важных стратэгічных аб'ектаў, а не аб тым, каб разганяць людзей на вуліцы. Гэта вельмі важны момант з пункту гледжання дэманстрацыі нашаму геапалітычнаму асяроддзю адзінства АДКБ», — сказала ў эфіры тэлеканала АНТ доктар палітычных навук, прафесар МГІМО МЗС Расіі Алена Панамарова.

Аляксандр Лукашэнка за час падзей у Казахстане некалькі разоў сазвоньваўся з Касым-Жарматам Такаевым і Уладзімірам Пуціным. Гаварыў беларускі лідар і з Ніколам Пашынянам, кіраўніком Арменіі, якая старшынствуе ў АБСЕ, і з першым прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Беларусі важна, каб сітуацыя ў Казахстане вярнулася ў прававое рэчышча, падкрэсліваў кіраўнік нашай дзяржавы пры любым выпадку. «Цяпер актуальнай становіцца не толькі тэма эканамічнай інтэграцыі, але і тэма інтэграцыі ў галіне бяспекі. Беларускі міратворчы кантынгент выконвае важную місію, арыентаваную на забеспячэнне інтарэсаў не толькі Расіі, краін АДКБ, але і ў першую чаргу ўласных інтарэсаў. Страта Казахстана для нас — гэта страта вялізнага рынку збыту, таму што значныя аб'ёмы паставак тавараў і паслуг ідуць на казахстанскі рынак», — лічыць аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін.

На сёння папярэдне запланавана анлайн-канферэнцыя кіраўнікоў краін — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) для абмеркавання сітуацыі ў Казахстане. Будзем разам сачыць за развіццём падзей.

Аляксей КЛІМАЎ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Дзярждуме прапанавалі забіраць у багатых да паловы даходу

Пры даходах больш за 10 млн рублёў у год неабходна ўстанавіць падатак у памеры 25 %, а для звышпрыбытку — да 40—50 %. Пра гэта заявіў першы намеснік старшыні камітэта Дзярждумы па бюджэце і падатках Міхаіл Шчапаў.

«Пры гэтым для тых, хто атрымлівае мінімальны памер аплаты працы і менш, стаўка ПДФА павінна быць зніжана да 5 % ці да нуля. Гэта будзе больш справядлівая сістэма, яна прывядзе да скарачэння разрыву ў даходах, знізіць сацыяльную напружанасць», — дадаў ён. Дэпутат падкрэсліў, што цяпер назіраецца сур'ёзны сацыяльны разлом.

«Санітарка ў аддаленым пасёлку атрымлівае 10—15 тысяч рублёў у месяц, а член праўлення буйнога банка — дзясяткі і сотні мільёнаў рублёў», — сказаў на заканчэнне Шчапаў.

Брытанскі прафесар заявіў, што Зямля знаходзіцца на парозе масавага вымірання

Прафесар Стэндфардскага ўніверсітэта Пол Эрліх у гутарцы з Daily Mail папярэдзіў, што Зямля знаходзіцца на парозе шостай хвалі масавага вымірання.

«Масавае выміранне — толькі адна з узаемазвязаных экзістэнцыяльных пагроз, з якімі сутыкаецца цывілізацыя, іншыя ўключаюць парушэнне клімату, глабальнае атручэнне і аднаўленне гонкі ядзерных узбраенняў», — расказаў прафесар.

Паводле яго слоў, паводкі, засухі і лясныя пажары, выкліканыя зменамі клімату, могуць нанесці планеце такі ж сур'ёзны ўрон, як магутнае вывяржэнне вулкана або гіганцкі астэроід.

Эрліх адзначыў, што існуюць спрэчкі аб прычынах папярэдніх пяці масавых выміранняў, а ў навуковай супольнасці няма ні слова аб прычыне шостага, якое працягваецца. «Самыя багатыя сёння спажываюць занадта шмат, і ўсё гэта пагаршаецца гендарным фактарам, расавай і эканамічнай няроўнасцю», — сказаў ён.

Раней у Сусветным фондзе дзікай прыроды заявілі, што ў найбліжэйшыя дзесяць гадоў Зямля можа сутыкнуцца з самым масавым выміраннем жывёл з часоў знікнення дыназаўраў. На думку экспертаў, пад пагрозай знікнення — афрыканскія слоны, белыя мядзведзі, некаторыя акулы і рыбы. За 31 год папуляцыя афрыканскага ляснога слана скарацілася на 86 %, у той час як белыя мядзведзі ў небяспецы з-за раставання арктычных ільдоў.

«ГЭТЫЯ ЗМЯНЕННІ — ВЫНІК КАРПАТЛІВАЙ ПРАЦЫ ЎСІХ БЕЛАРУСАЎ»

Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:

— Новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — дакумент своечасовы, актуальны і неабходны. Падзеі 2020 года, эканамічныя санкцыі Еўрасаюза і ЗША (фактычна эканамічны генацыд нашага народа), нагнятанне ваеннай істэрыі на граніцах Беларусі, стварэнне для ўсяго свету вобраза нашай краіны як агрэсіўнай, таталітарнай дзяржавы, у якой зневажаюцца правы і свабоды грамадзян і якая «пагражае» ўсім народам Еўропы, сталі штуршком для перагляду Асноўнага Закона, канкрэтызацыі і пашырэння зместу яго артыкулаў, наданя Канстытуцыі сучаснага і прагрэсіўнага характару, які адпавядае рэаліям часу, адэкватна і зразумела адказвае на выклікі і правакацыі з боку знешніх ворагаў.

Канстытуцыя нашай краіны — гэта дарожная карта для кожнага яе грамадзяніна. А рэферэндум — своеасаблівае ўзгадненне гэтага дакумента з кожным з нас. Менавіта ад меркавання і падтрымкі народа, кожнага члена грамадства залежыць, якой будзе наша краіна ў найбліжэйшыя гады і дзесяцігоддзі, як пабудуюць сваё жыццё нашы дзеці і ўнукі. Тыя, хто заклікае не прыходзіць на ўчасткі для галасавання, тым ці іншым спосабам ігнараваць рэферэндум, фактычна наўмысна пазбаўляюць людзей права голасу, права выбару, штурхаюць грамадства да раз'яднання і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

Новая рэдакцыя Асноўнага Закона нашай краіны — дакумент глыбока прадуманы. У ім замацаваны і пашыраны пазіцыі, якія дадуць магчымасць беларускаму грамадству актыўна і ўстойліва развівацца, узнімаць эканоміку на новыя вышыні і пры гэтым захоўваць яе сацыяльную накіраванасць. У прыярытэце — традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, падтрымка мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, асаблівы клопат аб людзях пажылога ўзросту і інвалідах. Пашыраюцца перспектывы актыўнага ўдзелу моладзі ў развіцці краіны, магчымасці кожнага маладога чалавека праявіць сябе ў розных сферах жыцця грамадства, уносіць пасільны і адчувальны ўклад на карысць роднай зямлі.

Прыемна, што беларуская дзяржава паступова адыходзіць ад пазіцыі «нянькі» ў дачыненні да сваіх грамадзян, заахвочваючы іх жаданне быць актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх працэсаў, што адбываюцца ў краіне, не заставацца толькі назіральнікамі і «ўсёдасведчанымі» крытыкамі, а падзяляць і прымаць салідарную адказнасць за лёс краіны, бачыць і разумець, што ад іх слоў і спраў залежыць, якім шляхам мы будзем развівацца. Вышэйшым прадстаўнічым органам народаўладдзя павінен стаць Усебеларускі народны сход, дзейнасць якога будзе накіравана на вырашэнне актуальных задач грамадства.

Сувязным звяном усіх пакаленняў нашага грамадства была і застанецца памяць, беражлівае і адказнае стаўленне да яе. Не можа існаваць народ, які наўмысна адсякае свае карані, не ганарыцца сваімі продкамі. У гады Вялікай Айчыннай вайны нашы продкі аддалі жыцці за тое, каб сёння мы маглі называць сябе беларусамі, мець сваю мову, культуру, традыцыі. Яны ішлі ў бой за Радзіму — свой народ, свой род, сваю радню, сваіх родных, каб у будучыні змаглі нарадзіцца іх унукі. Гэтыя пастулаты замацаваны ў праекце новай рэдакцыі Канстытуцыі. Абавязак кожнага з нас — з павагай і пашанай захоўваць і перадаваць з пакалення ў пакаленне Вялікую памяць аб героях і іх бяспрыкладных подзвігах. Можа быць, надышоў час кожнаму з нас адкрыць свае сямейныя альбомы і здзейсніць «вандраванні» ў гісторыю сваіх сем'яў, каб больш глыбока і ўдумліва зразумець падзеі мінулага, каб ніхто на свеце не змог выкрасці, перакруціць гістарычную памяць нашага народа!

Беларусь пасля набыцця незалежнасці ідзе сваім самабытным шляхам. За гэтыя гады нам удалося стварыць дзяржаву, якая паслядоўна і ў інтарэсах сваіх грамадзян выстойвае знешнюю і ўнутраную палітыку, клапоцячыся аб дабрабыце, развіцці і рэалізацыі жыццёвых планаў кожнага члена грамадства. Канстытуцыя ў яе новай рэдакцыі дасць магчымасць кожнаму з нас намеціць новыя перспектывы і ўпэўнена рухацца наперад, захоўваючы ў будучыні адзінства і згуртаванасць беларускага народа, суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны.

Тамара ДАЛГАШЭЙ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы:

— Мяне як работніка медыцынскай галіны больш хвалююць сацыяльныя аспекты змяненняў, выкладзеных у праекце. Напрыклад, артыкул 12. У ім гаворыцца, што Беларусь можа даваць права прытулку замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства. Усе мы, а многія дэпутаты ўвачавідкі пераканаліся, якая дапамога аказваецца бежанцам на беларуска-польскай граніцы. Сюды, у лагер, бясконца ідуць машыны з гуманітарнай дапамогай. Такім чынам, гэта права ўжо рэалізоўваецца, а цяпер будзе замацавана заканадаўча.

Хачу звярнуць увагу на артыкул 15, які рэгламентуе захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё ўсіх культур і нацыянальнасцяў, забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як мінімум паўгода работнікі пракуратуры вядуць работу па пошуку людзей, сведкаў ваенных падзей. Адным з такіх сведкаў, у прыватнасці, стаў мой 91-гадовы бацька, які на працягу дзвюх гадзін расказваў пра тое, што адбывалася на яго вачах. Гэтую праўду неабходна перадаваць з пакалення ў пакаленне і лічыць яе нацыянальнай спадчынай.

У артыкуле 21 гаворыцца аб захаванні правоў і свабод грамадзян. Мяне ўзрадавала дапаўненне аб тым, што кожны павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, уносіць пасільны ўклад у развіццё грамадства і дзяржавы. Змяненне мае на ўвазе знікненне ўтрыманскіх тэндэнцый і павышэнне асабістай адказнасці кожнага чалавека. Трэба працаваць, дэманстраваць адказнасць не на словах, а на справе. Дзяржава клапоціцца аб сваіх грамадзянах, але і чалавек, у сваю чаргу, павінен праяўляць сябе ў карыснай для дзяржавы дзейнасці.

Не магу пакінуць без увагі артыкул 32, у якім ідзе гаворка пра шлюб, сям'ю, мацярынства і дзяцінства. У прыватнасці, канкрэтна прапісана, што законным з'яўляецца толькі шлюб паміж мужчынам і жанчынай. Лічу гэта важным для захавання не толькі сям'і, яе каштоўнасцяў, але і ўвогуле ўсяго грамадства. Таксама прапісваецца, як дзяржава падтрымлівае сем'і з дзецьмі, дзяцей-сірот. Дарэчы, гэта ўвага заўважная асабліва цяпер, у навагоднія дні, калі ідзе шырокамаштабная акцыя «Нашы дзеці», да якой далучаецца вялізная колькасць прадстаўнікоў улады і ўвогуле многіх прадпрыемстваў і арганізацый. Дэпутаты таксама не застаюцца ўбаку — аказваюць дапамогу дзецям-інвалідам.

Яшчэ хачу звярнуць увагу на 45 артыкул, які датычыцца аховы здароўя. Мы бачым, якая значная работа вядзецца дзяржавай у гэтым кірунку. Але і самі грамадзяне павінны прымаць меры па захаванні і ўмацаванні свайго здароўя. Усе магчымасці для гэтага ёсць, як і спартыўныя базы, басейны, аздараўленчыя комплексы.

Паколькі я працую ў камісіі па экалогіі, 46 артыкул якраз па гэтай тэме. У ім гаворыцца, што кожны грамадзянін Беларусі мае права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе, а дзяржава, у сваю чаргу, ажыццяўляе кантроль за рацыянальным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў для паляпшэння якасці жыцця. Увогуле, усе змяненні скіраваны на паляпшэнне жыцця грамадзян і ўмацаванне дзяржаўнасці.

Валерый ДУНАЙ, рэктар Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта:

— Неабходнасць змяненняў у Канстытуцыю абумоўлена тым багажом станоўчага досведу, які быў назапашаны намі за гады развіцця Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржавы. Вопыт дзяржаўнага будаўніцтва, сацыяльнай роўнасці і сацыяльнай накіраванасці дзяржаўнай палітыкі, падтрымка навукі, інавацыі і адукацыі, павага да сваёй гісторыі і подзвігаў беларускага народа — тое, што неабходна захаваць для наступных пакаленняў. Менавіта гэта і адлюстравана ў праекце змяненняў і дапаўненняў. Усе гэтыя змяненні — вынік карпатлівай працы ўсіх беларусаў, чые прапановы і меркаванні былі ўлічаны і разгледжаны пры падрыхтоўцы праекта. Таму так важны ўдзел кожнага грамадзяніна ў абмеркаванні і прыняцці абноўленага Асноўнага Закона Беларусі.

Хацелася б асабліва звярнуць увагу на дапаўненні, якія датычацца дзяржаўнай падтрымкі моладзі. Дзяржавай створаны ўмовы для ўсебаковай падтрымкі і развіцця моладзі ў розных сферах. Нам важна замацаваць гэта ў Асноўным Законе, каб працягваць не толькі раскрываць патэнцыял маладога пакалення беларусаў, але і накіроўваць іх ідэі і ініцыятывы на карысць нашага грамадства і дзяржавы.

Выхаванне грамадзяніна, які паважае закон, гісторыю і традыцыі свайго народа, адбываецца як у грамадстве, так і ў коле сям'і. Вельмі важна, што абавязак бацькоў прапануецца замацаваць у Канстытуцыі. Гэта дапаможа ўмацаваць сувязь установы адукацыі і сям'і ў выхаванні патрыятычна настроеных, сацыяльна актыўных грамадзян, гатовых берагчы і памнажаць усё, чаго мы ўжо дасягнулі, уладкоўваць і развіваць сваю Радзіму.

Маргарыта УШКЕВІЧ. Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

З ЗАЎВАГАМІ І ПРАПАНОВАМІ — У ГРАМАДСКУЮ ПРЫЁМНУЮ

Працягвае работу грамадская прыёмная пры Савеце Рэспублікі для абмеркавання змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Члены Савета Рэспублікі гатовы асабіста выслухаць усіх, хто мае прапановы па праекце Асноўнага Закона, і адказаць на іншыя пытанні, якія хвалююць грамадзян, **кожныя панядзелак, сераду і пятніцу з 11.00 да 17.00 па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, 47.**

У панядзелак, 10 студзеня, сустрэчу з грамадзянамі правядуць: **з 11.00 да 14.00 — старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, з 14.00 да 17.00 — намеснік старшыні Савета Рэспублікі Леанід ЗАЯЦ.**

У сераду, 12 студзеня, з 11.00 да 14.00 сустрэчу з грамадзянамі правядзе **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Алег РУМО, з 14.00 да 17.00 — член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Наталля ЯКУБІЦКАЯ. 14 студзеня з 11.00 да 14.00 — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ, з 14.00 да 17.00 — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ.**

ДАСЛОЎНА

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА:

«Ініцыятыўныя групы, калектывы прадпрыемстваў, жыхары глыбока вывучаюць новаўвядзенні, якія могуць быць унесены ў Канстытуцыю. Тое, што выпрацавана на ініцыятыўных пляцоўках, было прапанавана жыхарамі, кіраўнікамі, напэўна, атрымала аптымальны варыянт. Змяненні ў Канстытуцыю ўсё ж патрэбны. Павінны быць унесены дапаўненні, якія паспрыяюць, каб наша дзяржава ў далейшым была стабільнай.

У праекце Канстытуцыі прапануецца надзяліць высокімі паўнамоцтвамі Усебеларускі народны сход. Верагодна, гэтая галіна ўлады будзе эфектыўнай на доўгія дзесяцігоддзі. Беларусы гэта абмеркавалі і, напэўна, дадуць гэтаму добра».

Калі ў вас з'явіцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна дасласць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».

ПРАЕКТ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Падрабязней на pravo.by

Добрая традыцыя

КАЛЯДЫ — ЧАС ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЖАДАННЯЎ... І НАВАТ СПАРТЫЎНЫХ

Праводзіць калядныя святы можна не толькі за сталом, а напрыклад, на хакейным матчы. Менавіта такім чынам зрабіў Прэзідэнцкі спартыўны клуб у рамках акцыі «Калядная традыцыя». Гульцы хакейнай каманды Прэзідэнта разам з прадстаўнікамі клуба завіталі ў госці да выхаванцаў Вілейскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната. Сустрэча прайшла на лёдзе маладзечанскага спартыўна-забаўляльнага цэнтра.

Гульцы хакейнай каманды Прэзідэнта і дружына «Вілейскія шчупакі», сабраная з вучняў школы-інтэрната, правялі таварыскі матч. Нягледзячы на сяброўскую сустрэчу, барацьба падчас матча была сапраўдная, спартыўная. «Шчупакі» ўжо ў першым перыядзе вырваліся наперад — 5:3. У другой палове матча прафесіяналы

змаглі скараціць адставанне. Але «Вілейскія шчупакі» пазіцыі не здалі і давялі гульню да сваёй перамогі з вынікам 8:7.

«Гэта ў нас толькі першы матч. Можа, і ў наступным годзе прыедуць, а мы патрэніруемся, станем мацнейшымі і будзем гуляць лепш. Галоўнае — перамагчы, але і ўдзельнічаць таксама добра», — падзяліўся нападаючы «Вілейскіх шчупакоў» Глеб Варывода.

Гэты матч стаў бадай ці не першым для дарослых прафесійных хакеістаў, дзе галоўнымі былі не лічбы на табло, а эмоцыі і ўражанні сапернікаў. «Было выдатна! І важна для дзяцей. Яны атрымалі вопыт і мноства яскравых эмоцый. Ці крыўдна прайграваць? Гэта спорт. Абедзве каманды імкнуліся дабіцца лепшага выніку, але склалася так, як склалася. Спадзяёмся, што мы яшчэ адыграемся, калі традыцыя працягнецца і ў наступным годзе!» — адзначыў Максім Шыманскі.

Пасля добрай гульні належыць добра адпачыць, вырашылі ў Вілейскай школе-інтэрнаце. Адпачынак атрымаўся сапраўды святочны: з казачным прадстаўленнем, карагодамі (у тым ліку і з удзелам дарослых хакеістаў), чаем і смачнымі пачастункамі.

«Калядная традыцыя» — адзін з кранальных праектаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Сёлета ён адзначае юбілей — дзесяць гадоў. Вілейская школа-інтэрнат была абрана невыпадкова. Па-першае, дзеці тут займаюцца хакеем, і яны марылі выйсці на лёд і згуляць з выдатнымі хакеістамі. Па-другое, паважаюць і іншыя віды спорту: сплаўляюцца на байдарках, катаюцца на веласіпедах, — падкрэсліў **старшыня цэнтральнага савета рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб» Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.**

Па добрай традыцыі госці прыехалі не з пустымі рукамі. Паколькі ў школе-інтэрнаце спорт у пашане, то і падарункі адпаведныя. Хакеісты «Вілейскіх шчупакоў», якія ўсе былі прызнаны найлепшымі гульцамі матча, атрымалі клюшкі. Таксама каманда Прэзідэнта прывезла выхаванцам школы 30 новенькіх горных веласіпедаў. Цяпер паходы стануць больш захапляльнымі і зручнымі. Выхаванцы атрымалі мноства прыемных сюрпрызаў — канструктары Lego, настольныя гульні, фітнес-бранзалеты, навушнікі ды іншае. А Прэзідэнцкі спартыўны клуб пералічыў школе 30 тысяч беларускіх рублёў.

Дырэктар Вілейскай школы-інтэрната Уладзімір Барысаў расказаў журналістам, што сродкі будуць накіраваны на фізкультурна-аздараўленчую дзейнасць: «Вялікую ўвагу ўдзяляем пазаўрочнай дзейнасці: паколькі ў нас шмат хлопчыкаў, асабліва папулярныя фізкультурна-аздараўленчы і турыстычны напрамкі. У мінулым годзе, напрыклад, наша хакейная каманда заняла першае месца ў абласных спаборніцтвах «Залатая шайба» і чацвёртае — на рэспубліканскім узроўні. Акрамя таго, ходзім у пешыя і велапаходы, сплаўляемся на байдарках, таму

падарункі, якія дзецям уручылі госці, стануць вялікай падмогай для далейшых заняткаў. Задумак хапае. У нас на тэрыторыі ёсць спартыўныя трэнажоры і гульнявыя пляцоўкі, але іх не бывае шмат. Калі набудзем не асобныя элементы, а цэлую гульнявую пляцоўку, гэта будзе вельмі карысна для дзяцей, для карэкцыйнай работы. І, вядома, хлопцы будуць адчуваць радасць, праводзячы там свой вольны час».

Сёння ў Вілейскай спецыялізаванай школе-інтэрнаце вучацца 127 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія маюць парушэнні маўлення і цяжкасці ў навучанні. З іх 26 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без папячыцельства бацькоў. Яны маюць патрэбу ў спецыяльнай адукацыі і спецыяльнай карэкцыйнай дапамозе. І, вядома, у пазітыўных эмоцыях і цікавых сустрэчах.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Аліны МАЗАВЕЦ,
г. Маладзечна, Вілейка.

Актуальна

МІНСКІЯ ЎЛАДЫ МАЮЦЬ НАМЕР МАКСІМАЛЬНА АПЕРАТЫЎНА АДНАВІЦЬ РУХ У РАЁНЕ АБВАЛЬВАННЯ МОСТА НА НЯМІЗЕ

Як паведамлялася раней, ноччу 8 студзеня паступіла паведамленне аб абвальванні моста на праспекце Пераможцаў над вуліцай Няміга ў Мінску. У выніку здарэння ніхто не пацярпеў. Рух на гэтым участку быў спынены, на месцы працавала следча-аператыўная група, якая правяла агляд месца здарэння, была зафіксавана следавая карціна, апытаны відавочцы.

Фота Бел ГА.

«Цяпер мы вывучаем прычыны таго, што адбылося. Працуем над тым, каб у найкарацейшыя тэрміны ліквідаваць наступствы, заявіў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ.** Паводле яго слоў, прыцягнуты спецыялізаваныя брыгады, якія забяспечваюць разборку пашкоджаных канструкцый. «Мы будзем і надалей займацца прывядзеннем пуцепавода ў належны стан, каб максімальна аператыўна аднавіць рух на гэтым участку. Мы ўжо распрацавалі схему арганізацыі дарожнага руху, якая мінімізуе наступствы. Яна аператыўна даведзена да жыхароў Мінска і гасцей сталіцы, каб кожны мог прагназаваць свой маршрут і скараціць страты асобнага часу», — сказаў ён.

У сувязі з часовым абмежаваннем руху транспарту ў гэтай частцы горада з-за абвальвання моста Дзяржаўтаінспекцыя заклікае кіроўцаў загадзя прадумваць маршрут руху ў гэтай частцы сталіцы.

На гэты момант закрыты рух усіх відаў транспарту на наступных участках:

участак вул. Максіма Багдановіча ад вул. Янкі Купалы да пр. Пераможцаў;

участак вул. Няміга ад вул. Гарадскі Вал да пр. Пераможцаў;

участак вул. Леніна ад вул. Інтэрнацыянальнай да вул. Няміга;

участак пр. Пераможцаў ад вул. Мельнікайтэ да вул. Няміга.

Для зручнага перамяшчэння гараджан супрацоўнікі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі сумесна з праектнымі арганізацыямі распрацоўваюць альтэрнатыўную схему руху з улікам уведзеных абмежаванняў і пераразмеркаваннем маршрутаў грамадскага транспарту.

Дадатковыя экіпажы ДАІ накіраваны ў цэнтральную частку горада для забеспячэння дарожнай бяспекі і перанакіравання транспарту на другое транспартнае кальцо. Каб пазбегнуць заторавых сітуацый, аўтаматарам неабходна пры перамяшчэнні па горадзе абмінаць прылеглыя да месца здарэння вуліцы.

Як паведаміў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр ДАРАХОВІЧ,** з-за інцыдэнту на пуцеправодзе праз вул. Няміга будзе адкладзены рамонт пуцепавода на пр. Жукава ў раёне чыгуначнай станцыі Мінск-Сартавальны.

Тым часам, паводле інфармацыі ў тэлеграм-канале «Мінск. Афіцыйна», на Нямізе ідзе дэмантаж пралётаў моста. Ужо раніцай у суботу былі вывезены на ўтылізацыю абломкі аднаго пралёта. На дэмантажы пуцепавода ноччу было задзейнічана больш за 30 чалавек.

«Цяпер па чарзе будзем разбіраць астатнія пралёты пуцепавода. Тэхнікі і людзей хапае, каб працаваць кругласутачна. Усе да сітуацыі ставяцца з разуменнем. Усяго тут чатыры пралёты, першы з іх плануем разабраць за тыдзень», — сказаў **дырэктар ДП «Гардарбуд» Сяргей ПАНЕЎ.**

ВЯРТАННЕ Ў ВІФЛЕЕМ

Сакрэты беларускай батлейкі

Каляды заўсёды адзначаліся з размахам. Так, у Фларэнцыі горад ператвараўся ў старажытны Віфлеем. Знакамітыя мастакі малявалі дэкарацыі, на розных пляцоўках разыгрываліся біблейскія сцэны.

З цягам часу некаторыя традыцыі адыходзілі, пра асобныя сюжэты і персанажаў (як, напрыклад, пра цара Ірада) на святы пераставалі згадваць. Але на Беларусі ўсе гэтыя сярэднявечныя містэрыі працягвалі жыць у маленькай скрыні — батлейцы. Уласна, сама назва «батлейка» звязана з Віфлеемам (на Беларусі месца нараджэння Хрыста называлі Бэтлеемам).

Сёння батлейка актыўна адраджаецца. На зімовых канікулах батлеечныя спектаклі ідуць у многіх музеях і аграсядзібах, аднаўляць старажытны лялечны тэатр бяруцца дзеці ў школах і цэнтрах дадатковай адукацыі.

Калі раней батлеечныя спектаклі былі выключна калядныміі, то сёння лялькі ў скрынях могуць ажываць на працягу года, і аўтары эксперыментуюць са сцэнарыямі.

Так, у Жодзінскай гімназіі № 1 стварылі спектаклі, якія, у тым ліку, распавядаюць пра паходжанне назвы горада і пра вайну. Барысаўскія школьнікі спрабавалі ажыўляць батлейку летам і рабіць імпрэзу, завязаную на купальскіх сюжэтах. У Ашмянскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі батлеечнікаў зацікавіў лёс земляка-святара, пісьменніка Язэпа Германовіча, вядомага пад псеўданімам Вінцук Адважны. Ён шмат пісаў пра сваю малую радзіму, а таксама ствараў тэксты для батлеечнага тэатра, адзін з іх «Адам і Анэлька» гурткоўцы абралі для пастаноўкі. У аграсядзібе Стулы пры дапамозе лялек з батлейкі распавядаецца пра лёс народнага майстра. Аўтары сцэнарыя на аснове гутарак з мясцовым разьбяром па дрэве стварылі спектакль, які распавядае пра трагедыю вёскі, што некалі была шматлюднай, а пасля ў ёй застаўся толькі адзін жыхар.

Праўда, такія «вольнасці», звязаныя з пошукам новых сюжэтаў і часам паказу спектакляў, некаторыя аматары класічнай батлейкі не прымаюць. Нельга забывацца, калі і для чаго з'явілася батлейка. Магчыма, першыя прадстаўленні рабілі манахі-езуіты, з дапамогай шоу спрабавалі падаваць людзям біблейскія сюжэты, нагадваць пра нараджэнне Хрыста.

ЧАРОЎНАЯ СКРЫНКА

Спектакль ладзіцца ў такі час, калі гледачы чакаюць нечага незвычайнага (з батлейкай хадзілі па хатах на Каляды і Новы год). Таму існуе столькі розных нюансаў, якія павінны ўлічыць стваральнікі скрыні і лялек, і акцёры. Часам усю канструкцыю імкнуцца прыгожа распісаць і звонку, і знутры. Але важна ўмець рабіць сюрпрызы для гледачоў. Лепш, калі скрыня непрывабная, але адчыняюцца створкі... — і гледачы замiраюць, раскрываецца цуд. У класічнай батлейцы можа быць два-тры ярусы. Верхні (нябёсы) — для анёлаў і святых, а на ніжніх (зямля і падземны свет) могуць адбывацца дрэнныя з'явы і падзеі. Калі ўвесь спектакль праводзіць адзін акцёр,трэба адаптаваць сцэнарый так, каб былі задзейнічаны дзве рукі.

Варта пазбягаць доўгіх тэкстаў, бо маленькая нерухомая лялька не зможа доўга трымаць увагу гледача. Лялькаводу давядзецца пастарацца, каб ужо сваім голасам, аповедам, рухамі цацкі выклікаць эмоцыі ў тых, хто прыйшоў паглядзець выступленне. А яшчэ маленькая батлейка не для вуліцы: яна не разлічана на натоўпы.

ДЫК ЧЫЙ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ?

У гэтыя навагоднія святы батлейку можна было паглядзець на фестывалі «Радасць», які праводзіцца ў Мінску. Сюды са сваімі спектаклямі на калядную тэматыку прыязджалі калектывы з розных гарадоў Беларусі — Магілёва, Ракава, Віцебска, Лагойска, Гродна, Ляхавіч. Сярод іх — як спрактыкаваныя лялькаводы, удзельнікі батлеечных фестываляў, так і пачаткоўцы. У праграме, у тым ліку, — выступленні тэатраў ценяў. А яшчэ тут можна праглаласаваць за работы ўдзельнікаў конкурсу «Калядны вярцеп», у межах якога дзеці з нядзельных школ пры праваслаўных прыходах ствараліі вырабы на сюжэт нараджэння Хрыста. Найлепшыя работы будуць перададзены ў дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў.

— Любы дзіцячы твор мае такую ж глыбіню, як і дарослы. Там кожны ўбачыць сваё, — дзеліцца Ірына Машчэнская, якая паказвае спектакль «Каляды Дзеда Мароза». — На паводзінах герояў можна адкрываць многа маральных аспектаў. Бывае, дарослыя плачуць на спектаклях, калі лялькі душэўна, шчыра агучаны. Пасля паказу гутарым з дзеткамі, яны адкрываюць для сябе новае.

Гэты батлеечны тэатр створаны пры Свята-Елісавецінскім манастыры і працуе больш за дзесяць гадоў. Але цяпер для гледачоў быў сюрпрыз. Традыцыйны батлеечны спектакль «Цар Ірад», на думку Ірыны, не зразумелы сучасным дзецям, не засяроджаны на галоўнай, святочнай падзеі — нараджэнні Хрыста і наогул можа падацца страшным. А яшчэ аказалася, што часта дзеці не ведаюць біблейскіх сюжэтаў. Ёсць свята Раства, але малыя не адчуваюць яго сутнасць. Часта на пытанне: «Дык чыё нараджэнне мы святкуем?» адказваюць: «Дзеда Мароза!». Таму герой новага спектакля — сучасны хлопчык Ваня, які хоча павіншаваць Дзеда Мароза, але чароўным чынам трапляе ў старажытны Віфлеем.

Гасне святло. Адчыняецца скрыня. І маленькія гледачы замiраюць... Зачараваная батлейка задае калядны настрой, зачароўвае, адкрывае дзецям сакрэт, якому ўжо дзве тысячы гадоў.

Вернісаж

Калі раскрываецца ззянне, або Шлях з небыцця

У Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася экспазіцыя, прысвечаная рэстаўрацыі ўнікальных помнікаў сакральнага мастацтва XVIII—XIX стагоддзяў са збораў установы. Праект рэалізоўваецца дзякуючы гранту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры на 2021 год.

Сёння тут захоўваецца каля 500 тысяч музейных прадметаў. Не ўсе рарытэты трапляюць ва ўстанову ў належным стане. Некаторыя літаральна даводзіцца выцягваць з небыцця. Але дзякуючы карпатлівай, далікатнай, няпростай працы рэстаўратара, ім вяртаецца былая прыгажосць. Так, у музеі экспануюцца прадметы сакральнага мастацтва, над якімі на працягу года працавала таленавіты мастак-рэстаўратар супрацоўнік рэстаўрацыйнага аддзела Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Юлія Дранец.

Рэстаўрацыя, рэканструкцыя, аднаўленне і кансервацыя — не проста вяртанне аблічча прадмету. Калі старадаўнія тэхналогіі часткова страчаны, а новыя матэрыялы могуць паўплываць калі не на выяву, дык на структуру экспаната, рэстаўратарам даводзіцца пастаянна прымаць сур'ёзныя рашэнні і несці за іх адказнасць, старацца зрабіць усё магчымае, каб захаваць аўтэнтычнасць. Натуральна, спецыяліст павінен валодаць рознымі прыёмамі, але разам з тым быць высокаадукаваным і эстэтычна адораным, адчуваць прыгажосць прадметаў, што да яго трапляюць.

Калі параўноўваеш адноўлены шэдэўр з фатаграфіямі, зробленымі з прадметаў да рэстаўрацыі, бачыш, як часам людзі не ўмелі абыходзіцца з культурнай і духоўнай спадчынай.

Так, калі са скульптур анёлаў была знята страшная фарба, адкрылася іх першапачатковае залацістае ззянне. Царская брама XIX стагоддзя была замазана рэзкай руковай фарбай, а дзякуючы рэстаўратару ёй вернута пазалота, срэбра, якія гарманічна спалучаліся з блакітам. Яшчэ адзін унікальны экспанат, што адрадзіла Юлія Дранец, — фігура Хрыста, зробленая ў XIX стагоддзі. Падобных драўляных фігур захавалася не так многа, хоць раней яны стаялі ці не ў кожнай вёсцы, капліцы. «Юлія далікатна зрабіла далепкі ляўкасу, стала заўважна, як Хрыстос стаяў, прыхіляўся да сцяны. Скульптура ажыла», — заўважыў **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Юрый ПІСКУН.**

У экспазіцыі таксама прадстаўлены фрагменты царскай брамы (медальёны з мастацкімі выявамі святых і разьбой) XVIII стагоддзя. Гэтыя фрагменты з'яўляюцца помнікам сакральнага мастацтва і ўяўляюць сабой унікальныя ўзоры традыцыйнага майстэрства беларускіх разьбяроў па дрэве. У пачатку 70-х яны былі вывезены мастаком Яўгенам Куліком з зачыненай драўлянай царквы ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці. А ў 2012 годзе перададзены ў Нацыянальны гістарычны музей.

Адна з ідэй гэтай выставы — паказаць, наколькі багатай была сакральная спадчына. Прадстаўлены прадметы з розных рэгіёнаў Беларусі — Заходняга Палесся, Паазер'я, Панямоння, Цэнтральнай часткі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ЧАЙНЫ КАЛЕЙДАСКОП

Па гарызанталі: **1.** Дзе ёсць чай — там і пад ёлкаю ... (прык.); 15-га снежня — Міжнародны дзень чаю. **2.** «Чай павінен быць, як жаночы ... — моцны, гарачы і салодкі». Цытата невядомага аўтара. **7.** ... моцна трашчыць — будзе мароз (прыкм.). **9.** Не ..., што п'еца вада (прык.). **11.** Спартсмен, які плавае брасам. **12.** «Чай можа замяніць ..., а віно не заменіць чай». Чжан Чаа. **16.** Земляроб. **17.** Адвага, рашучасць. **18.** Лішак грошай пры разліку. **20.** Ганна, або ... Прысвятак, які адзначалі 22-га снежня («На ... сядайце на санкі» (прык.). **21.** «Чай — самая даступная ..., якія лечаць і кішэні не выварочваюць». Цытата невядомага аўтара. **22.** Лазня без веніка — што ... без трубы (прык.). **26.** Імкненне да чаго-небудзь. **29.** ... стаўбом — да марознага надвор'я (прыкм.). **30.** Тое, што і касманаўт. **31.** Ваду пі, як ..., а віно — як кароль (італьянская прык.).

Па вертыкалі: **1.** Дрэва, ягадамі якога зімой любяць ласавацца птушкі. **2.** Танцавальны крок. **3.** Памяшканне для вучэбнай стральбы. **4.** ... шуміць — чакай адлігі (прыкм.). **5.** Хавай ... у люты мароз (прык.). **6.** 17-я літара лацінскага алфавіта. **8.** Чай піць — не ... сячы (прык.). **10.** Тое, што і дранік. **13.** Новая з'ява ў мове. **14.** Вада — маці чаю, ... — яго бацька, а агонь — яго настаўнік (прык.). **15.** «Дзе чай — там і ...». Цытата невядомага аўтара. **19.** Край чаго-небудзь. **20.** І чай ненадоўга суцішае ... (прык.). **23.** Закончаная частка спектакля. **24.** Вокліч з пераможнай інтанацыяй. **25.** Даўгахвосты папугай. **27.** Нота музычнай гамы. **28.** Кармавая надбудова судна.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛІСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Рай. 2. Пацагунак. 7. Лёд. 9. Бараня. 11. Брасіст. 12. Віно. 16. Аратр. 17. Адчай. 18. Зграда. 20. Ганна. 21. Пекі. 22. Самавар. 26. Цяга. 29. Дыпломат. 31. Бык. **Па вертыкалі:** 1. Рабіна. 2. Па. 3. Цір. 4. Лес. 5. Нос. 6. Ку. 8. Дровы. 10. Драчонік. 13. Інавацыя. 14. Чайнік. 15. Нагавіч. 19. Акраек. 20. Гоглад. 23. Акт. 24. Агаі. 25. Ара. 27. Фа. 28. Кт.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.24	17.10	7.46
Віцебск —	9.21	16.53	7.32
Магілёў —	9.14	17.00	7.46
Гомель —	9.03	17.05	8.02
Гродна —	9.38	17.27	7.49
Брэст —	9.31	17.35	8.04

Месяц

Першая квадра 9 студзеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Ігната, Пятра, Агата, Сімона, Зіновіі.*
К. *Адрыяна, Ады, Вільгельма, Дануты, Рыгора, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Тата, — пытаецца сын, — а праўда, што сапраўдны мужчына павінен заставацца спакойным у любой сітуацыі?

— Праўда, сынок.

— Тады табе спачатку паказаць мой дзённік ці новую сукенку мамы?

Самы цяжкі год у сямейным жыцці — гэта бягучы.

— Мама, памятаеш тую старажытную вазу з фарфору, — пытаецца дачка, — якая перадаецца ў спадчыну з пакалення ў пакаленне?

— Вядома, памятаю. А што?

— Ды нічога. Проста маё пакаленне спыніла гэтую традыцыю.

anekdot.ru

Даты Падзеі Людзі

10 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1597 год — нарадзіўся Пётр Сімяонавіч Магіла, праваслаўны царкоўны і культурны дзеяч Рэчы Паспалітай. З 1627 г. кіева-пячэрскі архімандрыт, у 1632—1647 гадах мітрапаліт кіеўскі і галіцкі. У 1632 годзе заснаваў Кіева-Магілянскі калегіум і Магілёўскую праваслаўную епархію. Выступаў супраць Брэсцкай уніі (1596), садзейнічаў распаўсюджванню асветы і кнігадрукавання ў Беларусі і ва Украіне. Непасрэдна кіраваў Віленскім, Слуцкім, Магілёўскім і Аршанскім брацтвамі з манастырамі. Часта наведаў Вільню, Мінск і іншыя беларускія гарады. Аўтар кніг, якія выкарыстоўваліся як падручнікі ў духоўных навучальных установах.

1857 год — нарадзіўся (в. Сямёнавічы, цяпер Уздзенскі раён) Васіль Васільевіч Пашкевіч, беларускі вучоны ў галіне пладаводства, акадэміка УАСГНІЛ (1935), доктар біялагічных і сельскагаспадарчых навук, адзін з заснавальнікаў навуковага садоўніцтва ў Беларусі. У 1926—1931 гадах кіраваў абследаваннем садоў у Беларусі, зборам і сістэматызацыяй мясцовых гатункаў. Аўтар навуковых прац па вывучэнні пладовых культур і іх родапачатковых формаў, біялогіі цвіцення і плоданашэння, падборы апыляльнікаў. Заклаў асновы пародасартавога раянавання пладова-ягадных культур, культывавання лекавых раслін у Беларусі.

1910 год — нарадзіўся (в. Чарнова) Іван Ігнатавіч Крукаў, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 года. Старшы вадзіцель пантонна-маставога батальёна яфрэйтар Крукаў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Кіеўскай вобласці ў 1943 годзе: пад варожым агнём удзельнічаў у пераправе на пароме 2465 воінаў, 47 гармат, 3570 скрынь з боепрыпасамі. Удзельнік вызвалення Прагі, Парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года.

У свеце

49 год да н. э. — у гэты дзень Юлій Цэзар перасёк з войскам раку Рубікон — такім чынам была распачата грамадзянская вайна, якая прывяла да падзення рэспублікі і дыктатуры Цэзара. Па расповедах старажытных аўтараў, загад аб пераходзе Рубікона Цэзар аддаў пасля моцных ваганняў, сказаўшы пры гэтым: «Жэрабя кінута!». З тых часоў выраз «перайсці Рубікон» азначае «прайсці пункт незвароту», гэта значыць, учынена дзеянне, пасля якога ўжо немагчыма адмовіцца ад задумы або вярнуцца назад.



1863 год — у Лондане запушчана першая ў свеце лінія метрапалітэна (3,6 км).

1878 год — здабыта перамога рускіх войск і балгараў пад Шыпкай над 30-тысячным турэцкім войскам Весіль-пашы.

1920 год — уступіў у сілу Версальскі мірны дагавор, які завяршыў Першую сусветную вайну.

1943 год — пачатак аперацыі «Кольца», якая завяршыла Сталінградскую бітву.

Так гаварыў...

ЖАН ДЭ ЛАБРУЙЭР:

«Большасць людзей выкарыстоўвае лепшую палову свайго жыцця на тое, каб яшчэ больш маркотнай зрабіць горшую».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 68.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 студзеня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12